Для успешного развития агротуризма в Беларуси необходимо совершенствовать нормативноправовую базу, привлекать к разработке проектов и программ местные органы власти, а также создать конкурентоспособный бренд данной сферы услуг.

Адаптация и использование передового зарубежного опыта в области развития сельских территорий в условиях белорусской сельской экономики будет способствовать решению наиболее актуальных проблем, возникающих сегодня в сельской местности, и позволит существенно улучшить прогнозирование развития сельских территорий в Республике Беларусь.

**Литература:**


1. Леонова Н. В. Организационно-экономические основы развития сельских территорий в странах ЕС (на материалах Франции и Германии): Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата экономических наук. Москва, 2010.
2. http://lib.ololo.cc/b/197885/read http://lib.ololo.cc/b/197885/read. А.В.Камянчук, В.Н.Басков. Сельское сообщество XXI века: Устойчивость развития.
3. http://lib.vscc.ac.ru/index.php?module=Articles&action=view&aid=427 Дубиничева Л.В., Советов П.М. Агротуризм в развитии сельских территорий


# СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД У ФАРМІРАВАННІ ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАГА КОМПЛЕКСУ ВНУ


**Капусціч Т.М., намеснік дэкана факультэта прадпрымальніцтва і кіравання Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага універсітэта**


Маральна-духоўнае станаўленне маладога пакалення з'яўляецца адной з важнейшых умоў забеспячэння эканамічнага і сацыяльна-культурнага прагрэсу дзяржавы. Задача выхавання – у апераджаючым рэжыме ствараць выхаваўчыя сістэмы, якія забяспечваюць фарміраванне інтэлектуальных і маральных якасцей асобы. Гэта асабліва важна ў адносінах да студэнцтва – самай мабільнай і сацыяльна значымай групы насельніцтва.



Репозиторий БГАТУ

На пачатку дваццаць першага стагоддзя назіраем сярод моладзі павышэнне сацыяльнай трывогі, няўпэўненасці, нават агрэсіўнасці і жорсткасці. Адначасова павялічылася колькасць юнакоў і дзяўчат з дэвіянтнымі паводзінамі: распаўсюдвжанне курэння сярод дзяўчат, ужыванне алкагольных напояў і наркатычных рэчываў, брыдкаслоўе, вымагальніцтва і інш. І ў той жа час, нягледзячы на пералічаныя негатыўныя тэндэнцыі, у нашай краіне не страчаны традыцыі пераемнасці ў выхаванні, не разбураны многія традыцыйныя формы выхаваўчай работы. Выхаванне можна разглядаць як даволі кансерватыўную сферу, якая не церпіць рэвалюцыйных падыходаў. Разам з тым, выхаванне як неад'емная частка адукацыйнай сістэмы заключаецца ў фарміраванні асобы шляхам далучэння да культурных каштоўнасцей.

Выхаванне – гэта аспект узаемадзеяння людзей, спецыфічнай рысай якога з'яўляецца пастаноўка асаблівых – выхаваўчых – задач, вынікам – змяненне псіхалагічных характарыстык асобы. Задача выхавання ў вышэйшай навучальнай установе – арганізаваць узаемадзеянне выкладчык-студэнт (або студэнт - выкладчык), якое б валодала максімальным выхаваўчым патэнцыялам. Прадпасылкай дзейнасці выхаваўцы з'яўляецца асэнсаванне абставін, умоў, сітуацый, якія ён плануе ўключыць у выхаваўчы працэс. Ідэйна-выхаваўчая сістэма павінна прывучаць студэнта бачыць у фокусе свайго выбару і сваіх учынкаў адносіны да другіх людзей.

Ідэалагічная работа сярод студэнцкай моладзі – адна з асноўных функцый устаноў сістэмы адукацыі, якая забяспечвае фарміраванне грамадзянскіх якасцей асобы. Задача арганізатараў выхаваўчай работы – напоўніць ідэалагічна-выхаваўчую работу канкрэтным сучасным зместам. Першапачатковая мэта – фарміраванне правільнага разумення эканамічных і палітычных рашэнняў дзяржавы, іх матывацыя, кансалідацыя намаганняў усіх грамадзян краіны, у тым ліку і моладзі, для дасягнення галоўнай мэты – стварэння моцнай квітнеючай дзяржавы. Ідэйна-выхаваўчая работа не павінна зводзіцца да правядзення разавых акцый і мерапрыемстваў, як правіла,



Рэпазіторый БГАТУ

арыентаваных на даты календара. У сувязі з гэтым прафесарска-выкладчыцкім калектывам распрацоўваюцца свае ўласныя праграмы выхавання, дзе ўлічваюцца канкрэтныя магчымасці ўстановы адукацыі, соцыуму, патэнцыял моладзі, прадугледжваецца планамерная работа па ідэйна-маральнаму і грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню. Значныя выхаваўчыя магчымасці закладзены ў лекцыях, практычных, семінарскіх і лабараторных занятках. З гэтых пазіцый неабходна ацэньваць распрацоўваемыя намі планы, праграмы, навукова-метадычнае забеспячэнне. Мэты ідэйна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання дасягаюцца праз краязнаўчую, экалагічную, спартыўную работу. Улічваецца спецыфіка вышэйшай навучальнай установы, так як у кожнай з іх сваё стаўленне да полікультурнай адукацыі, да гуманітарнага аспекту ў сістэме дысцыплін.

У сучасным адукацыйна-выхаваўчым працэсе студэнцкай моладзі можна вызначыць наступныя напрамкі: выхаванне праз педагагічнае супрацоўніцтва (не толькі выклад матэрыялу выкладчыкам, колькі аказанне дапамогі студэнту ў атрыманні ведаў, уменняў і навыкаў; дапамога ў вырашэнні індывідуальных праблем, звязаных з навучаннем, асабістымі адносінамі, прафесійным і жыццёвым самавызначэннем і інш ); выхаванне ўласным прыкладам (тактычна-гуманныя адносіны ў педагагічным калектыве: узаемапавага, узаемадзеянне або сутворчасць, узаемадавер); выхаванне праз арганізацыю сумеснай дзейнасці (сувязь з рэальным жыццём, замацаванне ўменняў і навыкаў на практыцы) і інш.; выхаванне талерантнасці ў сабе і ў іншых (выхаванне пазітыўных адносін да сваёй культуры і культуры іншых краін і нацый); выхаванне праз валанцёрства (у працэсе аказання дапамогі выхаваўчая роля значна ўзрастае).

Выхаванне – складаная мадэль, якая разглядае педагагічную дзейнасць з розных бакоў. Не толькі куратар студэнцкай групы, але і звычайны выкладчык з'яўляецца не толькі транслятарам ведаў, пасрэднікам паміж падручнікам і студэнтам, а менавіта духоўным настаўнікам. Педагагічная сістэма адрознівае адукацыю і выхаванне: адукацыя – толькі працэс



Рэпазіторый БГАТУ

“укладання” у чалавека пэўнай інфармацыі, а выхаванне паступова фарміруе неабходную грамадству асобу. Методыка выхаваўчай работы павінна ўлічваць спецыфіку выкладаемых дысцыплін, а выхаванне павінна ажыццяўляцца перш за ўсё праз прадмет і асобу выкладчыка.

У працэсе навучання студэнт набывае навыкі не толькі прафесійных, але і сацыяльных зносін, засвойвае і даўно замацаваныя, і інавацыйныя нормы і правілы, што прыняты ў прафесійным грамадстве, гэта значыць авалодвае асновамі культуры паводзін. Пры ўдзеле ў featured рознабаковай пазнавальнай дзейнасці ён сутыкаецца з тымі або іншымі канфліктнымі сітуацыямі, якія патрабуюць прыняцця прадуктыўных рашэнняў. Валодаючы вопытам вырашэння канфліктаў, асоба на момант заканчэння вышэйшай навучальнай установы набывае веды, уменні і навыкі аксіялагічнага характару.

Высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія выходзяць з універсітэта, трапляюць ва ўсе куткі Беларусі, працуюць у дзяржаўнай і недзяржаўнай сферах, – гэта найлепшая рэклама для вышэйшай навучальнай установы.

Фарміраванне талерантнасці ва многім вызначаецца талерантнай культурай выкладчыка. Навучыць юнакоў і дзяўчат з павагай адносіцца да розных меркаванняў, развіваць у іх пазітыўнае мысленне – значыць закласці аснову для паспяховых партнёрскіх адносін паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў. Выкладчык паўстае ў якасці ўзору, эталона ў дзелавых сітуацыях: у аўдыторных і неаўдыторных зносінах.

У адладжанай сістэме выхаваўчай і ідэалагічнай работы асноўная роля адводзіцца куратару групы, які з’яўляецца выкладчыкам-“спутнікам” групы на працягу чатырох-пяці гадоў. Яго дзейнасць накіравана на адаптацыю студэнта да ўмоў вну і факультэта, на фарміраванне пачуцця калектывізму ў паўсядзённым жыцці, на патрыятычнае, грамадзянскае і культурна-эстэтычнае выхаванне асобы. Пры выбары куратара важна ўлічваць яго сацыяльную і прафесійную кампетэнцыю, адказнасць, валоданне духоўнай культурай. На метадычнае забеспячэнне работы куратара павінны быць накіраваны навуковыя намаганні гуманітарных кафедр: педагогікі і



Рэпазіторый БГАТУ

псіхалогіі, гісторыі і філасофіі. Таксама неабходна падтрымліваць практыку шэрагу рэспубліканскіх вну па мэтанакіраванай папярэдняй падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы куратараў.

Ключавым напрамкам выхаваўчай дзейнасці ўстаноў адукацыі і куратарскай работы з'яўляецца прафілактыка правапарушэнняў і злачынстваў сярод моладзі. Зыходзячы з гэтага, можна ўказаць на тыя задачы, якія куратар абавязаны рэалізаваць на працягу першага-другога курсаў: выхаванне і развіццё самасвядомасці (адносіны студэнта да сябе, да ўласнай і грамадскай дзейнасці; экалагічная свядомасць, якая дапамагае арыентавацца ў сістэме "чалавек – грамадства - прырода"); фарміраванне духоўнасці, патрыятызму, грамадзянскасці (выхаванне патрыятызму, міласэрнасці, працалюбства, прыстойнасці); фарміраванне жыццёвых і працоўных навыкаў (самаўдасканаленне праз працалюбства; павага да будучай прафесіі); выхаванне праз прыгожае (здольнасць бачыць і цаніць прыгожае; фарміраваць здаровы лад жыцця (адказ ад шкодных звычак).

Варта назваць фактары, якія ўплываюць на фарміраванне асобы ў калектыве: асоба выкладчыка (куратара); творчыя сітуацыі, напрыклад, сустрэчы з прадстаўнікамі творчых прафесій, экскурсіі, канцэрты, тэатральныя пастаноўкі; эўрыстычныя метады работы; калектыўныя формы сумеснай дзейнасці (асабліва ў невялікіх групах (падгрупах)); спрыяльны клімат у калектыве (у групе (падгрупе), на курсе, у пакоі інтэрната і інш.); сяброўства і адносіны з равеснікамі; тыповыя педагагічныя сітуацыі з элементамі творчасці; адносіны да выкладчыка (узаемаразуменне, узаемадапамога, супрацоўніцтва); падтрымка сувязей і павага да сям'і студэнта. Уплыў вышэйшай навучальнай установы на фарміраванне асобы студэнта займае другое месца пасля сям'і, таму важна, якія якасці мы пачнем выхоўваць у яго, пачынаючы з першага дня вучобы.

У любым выхаваўчым праекце, на мой погляд, павінна прасочвацца генеральная лінія, якая і будзе з'яўляцца асноўным напрамкам сумеснай дзейнасці "куратар – студэнт – сям'я". Змест і прынцыпы выхавання



Рэпазіторый БГАТУ

вызначаюцца накіраванасцю самога праекта і асаблівасцямі соцыуму. Ва ўсе часы апраўдвала сябе так званая гуманная педагогіка, якая несла і нясе дабро, святло і сардэчнасць. У праекце сумеснай дзейнасці павінны быць канкрэтна сфармуляваны ўмовы для развіцця творчай індывідуальнасці студэнта. Але неабходна адзначыць, што кожны выхаваўчы момант унікальны і не падлягае механічнаму пераносу ў новыя ўмовы.

Куратар садзейнічае выхаванню асобы практычнай, гуманнай, духоўнай і творчай, а для ажыццяўлення задуманага найперш неабходна ведаць студэнта: яго характар, прывітыя звычкі, сямейныя традыцыі і г.д. Для больш поўнага вывучэння студэнта курыруемай групы можна прапанаваць наступную схему: 1) агульныя звесткі пра студэнта (дата, месца нараджэння, звесткі пра сям'ю, матэрыяльнае становішча, стан здароўя, шкодныя звычкі); асаблівая роля адводзіцца спецыяльнасці, абранай студэнтам, узаемаадносінам у сям'і, месцу пражывання: інтэрнат, сям'я ці інш; 2) сацыяльныя патрэбы асобы (уменне і характар зносін з равеснікамі, дарослымі ці малодшымі; актыўнасць у калектыўнай працы, грамадскай і дабрачыннай дзейнасці); 3) месца і роля студэнта ў групе, адносіны з калектывам (ініцыятар, выканаўца ці назіральнік; лідэр, прызнаны член калектыву, ізаляваны, непрыняты; адносіны да выканання абавязкаў у групе; сяброўства, раўнадушша, сур'ёзнасць у адносінах з аднагрупнікамі і інш.); асаблівая ўвага: ці можа быць ініцыятарам і ў якіх выпадках? 4) адносіны да вучэбнай дзейнасці (наяўнасць здольнасцей, трываласць і сістэматычнасць ведаў, самастойнасць у асваенні дысцыплін, уменне ці няўменне арганізоўваць вучэбную дзейнасць, поспехі па ўсіх ці толькі асобных дысцыплінах і інш.); асаблівая ўвага: сярэдні бал студэнта, форма навучання (платная ці бюджэтная); 5) агульная накіраванасць асобы (устойлівыя інтарэсы, жыццёвыя планы, удзел у мастацкай самадзейнасці, адносіны да спорту, здольнасць да самаадукацыі і інш.); 6) агульныя вывады (станоўчыя і адмоўныя рысы студэнта; вызначэнне напрамкаў далейшай работы куратара).

Репозиторий БГАТУ

Галоўным вектарам удасканалення выхаваўчай работы павінна стаць аб'яднанне намаганняў узаемадзеяння з сям'ёй, з усімі сацыяльна-выхаваўчымі службамі. Арганізацыя выхаваўчай дзейнасці адбываецца з улікам спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату ў канкрэтнай навучальнай установе і на факультэце, традыцый і спецыфікі мікрасоцыуму, асаблівасцей выхавання ў сям'і. Вышэйшая прафесійная адукацыя на сучасным этапе развіцця грамадства прызвана задаволіць патрэбы асобы, дзяржавы ў атрыманні ведаў і прафесійнай кампетэнтнасці. У гэтым напрамку магчыма выдзеліць тры найбольш важныя блокі: кіраванне маўленчай культурай студэнтаў; удасканаленне інфармацыйнай культуры студэнтаў тэхнічнага профілю; фарміраванне палітычнай культуры студэнтаў.

Вытворчыя сілы ўступілі ў тую новую якасную фазу, калі іх прагрэс нельга забяспечыць толькі тэхнічнымі фактарамі без актуалізацыі сіл самаразвіцця, матывацыі, сутворчасці кожнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу. У сувязі з гэтым у многіх замежных методыках немалаважная роля адводзіцца культуры маўлення будучага спецыяліста. Сучасны стан маўленчай культуры спецыялістаў недастатковы. Магчыма, яго можна ацэньваць як крызісны і ў плане маўленчага этыкету, і ў плане абыдзеннасці лексікі, няўмення звязна і лагічна выразіць уласныя думкі. Педагагічна-выхаваўчымі ўмовамі сістэмы кіравання маўленчай культурай студэнтаў з'яўляюцца наступныя: прымяненне сістэмы камунікатыўных сітуацый, выкарыстанне сэнсавай інтэрпрэтацыі выказванняў і звязных тэкстаў, і, безумоўна, выкарыстанне педагагічных магчымасцей дыялогу. Існуюць функцыянальна-стылявыя нормы – гэта нормы выкарыстання мовы ў тыповых камунікатыўных сітуацыях. Веданне і прымяненне названай сістэмы вядомых і ў дастатковай ступені вывучаных норм сучаснай мовы забяспечвае мінімальны ўзровень маўленчай культуры па стылю мовы – правільнасць маўлення.

Рэпазіторый БГАТУ

Адукацыйна-выхаваўчая сфера непасрэдна працуе на будучыню, фарміруючы асабістыя якасці чалавека, яго веды, светапогляд, паводзіны, а ў выніку – духоўны і эканамічны патэнцыял грамадства.

## «ТЕОРИЯ РАВЕНСТВА» В ЭФФЕКТИВНОМ ИСПОЛЬЗОВАНИИ РАБОЧЕЙ СИЛЫ, ДВИЖУЩИЕ ФАКТОРЫ И МОДЕЛИ ОРГАНИЗАЦИИ РАБОЧИХ МЕСТ

**Курбанов Курбан Рамазан, старший научный сотрудник, Институт Экономики НАН Азербайджана, г. Баку**

Экономические реформы, претворяемые в жизнь в Азербайджанской Республике, требуют приобщения к передовым мировым стандартам и усвоения теоретических знаний, в том числе в области использования рабочей силы. С учетом интересов нашей республики заслуживает внимания поддержка развития агропромышленных отраслей в западных странах.

С полным основанием можно утверждать, что достижение высоких показателей производительности труда в США и других развитых странах мира является результатом применения научных требований «теории равенства» в отношении лиц, работающих на предприятиях и организациях. Рассмотрим сущность этих требований, представляющих интерес для рассматриваемого нами вопроса.

Известно, что на современном этапе развития одна из целей работников, занятых на агропромышленных предприятиях, пользующихся новыми поддержками, является получение справедливой оценки своего труда. При этом справедливость необходимо увязывать с равенством. Если к фермеру и работнику, обрабатывающему продукт результата фермерского труда, относятся также как и к другим работникам, занятым в данном производстве без дискриминации, то он бывает спокоен, чувствуя справедливость по отношению к себе. И, наоборот, в случае, если тот же работник осознает по отношению к себе нарушение равного подхода, т.е.



Репозиторий БГАТУ